Беларуская нацыянальная платформа
Форум грамадзянскай супольнасці
УСХОДНЯГА ПАРТНЁРСТВА

02.06.2014

**Заява**

**Беларускай нацыянальнай платформы**
**Форуму грамадзянскай супольнасці Усходняга партнёрства**

**з нагоды падпісання Рэспублікай Беларусь дамовы аб стварэнні Эўразійскага эканамічнага саюзу (ЕАЭС)**

*Мы, прадстаўнікі арганизацый грамадзянскай супольнасці, аб'яднаныя ў межах Беларускай нацыянальнай платформы, выказваем сваю нязгоду з падпісаннем Аляксандрам Лукашэнка ад імя нашай краіны дамовы аб стварэнні Эўразійскага эканамічнага саюзу.*

Падпісанне дамовы аб стварэнні ЕАЭС наносіць істотную шкоду нацыянальным інтарэсам Рэспублікі Беларусь, а таксама пазбаўляе нашу краіну шэрагу магчымасцяў геапалітычнага і цывілізацыйнага выбару, у тым ліку больш шчыльнага і перспектыўнага супрацоўніцтва з Еўрапейскім Саюзам і выкарыстання патэнцыяла Ўсходняга партнёрства.

Стварэнне ЕАЭС фактычна з'яўляецца альянсам аўтсайдэраў і не можа быць супрацьвагай Еўрапейскаму Саюзу ні па эканамічных параметрах, ні па якасных інстытуцыянальных і палітычных характарыстыках. Дамова аб ЕАЭС носіць дэкларатыўны характар і не можа забяспечыць задавальненне доўгатэрміновых  інтарэсаў Рэспублікі Беларусь.

У актуальнай сітуацыі ўдзел у інтэграцыйных праектах з Расійскай Федэрацыяй ва ўмовах фактычнай ваеннай агрэсіі гэтай краіны ў дачыненні да Украіны таксама наносіць шкоду рэпутацыі і  інтарэсам Беларусі ва ўзаемаадносінах з нашым паўднёвым суседам.

Прынацце рашэнняў аб удзеле нашай краіны ў наднацыянальных інтэграцыйных ініцыятывах такога кшталту і маштабу павінна адбывацца выключна на падставе вынікаў шырокага волевыяўлення грамадзян Беларусі. Паставіўшы свой подпіс пад дамовай аб ЕАЭС, Аляксандр Лукашэнка фактычна пазбавіў грамадзян права выбіраць геапалітычны накірунак развіцця Беларусі.

*Беларускія арганізацыі грамадзянскай супольнасці, удзельнікі Беларускай нацыянальнай платформы Форуму грамадзянскай супольнасці Усходняга партнёрства (больш за 60 арганізацый)*